*Дз.А. Лаўшук, І.М. Ячмянёва* (Магілёў)

# СЛОВЫ З ЭМАЦЫЯНАЛЬНЫМ ЗНАЧЭННЕМ У ПРОЗЕ К. ЧОРНАГА І М. ЗАРЭЦКАГА

Адметнай асаблівасцю слоў, надзеленых эмацыянальнымі афіксамі, з'яўляецца тое, што ацэнка ў іх выражаецца не лексічна, а граматычна. Таму фактычна любое слова, нават спецыяльнае ці тэрмін, алагічнае, з прыстаўкай і суфіксам суб'ектыўнай ацэнкі можа быць прылічана да разраду эмацыянальна-ацэначных: рука – *ручка*, дом – *домік*, кніга – *кніжачка* і інш. Эмацыянальныя афіксы ўносяць у слова элемент якаснай характарыстыкі, выклікаючы пэўную эмоцыю: ласку, спагаду і інш. Звычайна, такія словаформы шырока выкарыстоўваюцца ў штодзённым жыцці, дзе нараджаюцца ў вялікай колькасці за кошт прадуктыўнасці афектыўных суфіксаў як падкрэслена незвычайных экспрэсіўных сродкаў.

К.Чорны і М.Зарэцкі ў сваіх творах шырока скарыстоўваюць словы з эмацыянальна-ацэначнымі суфіксамі. Яны служаць там пэўным крытэрыем ацэнкі прадметаў і з'яў навакольнай рэчаіснасці, з'яўляюцца крыніцай афектыўнага ўздзеяння на іншых людзей, сродкам самасцвярджэння іх у наваколлі. Структура, прырода, характар асновы, з якімі спалучаюцца такія словы, – усё гэта прадвызначае шырокі дыяпазон розных эмацыянальных адценняў.

У творах празаікаў памяншальна-ацэначнае значэнне маюць назоўнікі з суфіксамі *-ок (-ёк), -ык (-ік), -эц (-ец), -очак (-ёчак), -ц-а (-ц-о, -ц-е), -іц (-ыц), -очк -эчк, -атк -ятк, -утк, -інк (-ынк), -ейк-, -эньк-* і інш. Вельмі часта выкарыстоўваюцца такія назоўнікі ў дзіцячым маўленні, у творах, адрасаваных дзецям, надаючы выказванням цёплыя, пяшчотныя, ласкальныя адценні. Напрыклад:



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

На сінім змарнелым *тварыку* ён выдаецца недалужна-ўзнятай дзюбкай [1, с.305]; Храбры *карузлік* засароміўся, *вочкі* ўтупіў [1, с.387]; Ціху, *дзядулька*, не плац!... А то цёця цукелкі не дасць...[1, с.387]; Каля зялёнай брамы ў зарослым дрэвамі двары стаялі тры *дзяўчынкі* і каля іх пакручваўся, на галоў дзве вышэйшы за кожную з іх, *хлапчук* [2, с.83].

Назоўнікі з памяншальна-ацэначным значэннем у творах М. Зарэцкага і К. Чорнага складаюць розныя лексіка-семантычныя групы, якія абазначаюць:

а) назвы асоб па роднаснай прымеце:

А ці будзеце вы слухаць свайго *дзядульку* Ільіча? [1, с.387]; Заплакаў, захліпаў, як *дзіцянё* [1, с.387];. І, можа, мая *дачушка* будзе жыць [2, с.65];

б) няродпасныя намінацыі:

А калісь, пэўна, *красуняй* была, якіх мала [1, с.64]; <...> заспакойвае баб прыказчык Саўка, маленькі, спрытны, рухавы *мужычок*, які спраўляецца ўсім паказаць, з усімі пагутарыць і ў той самы час зрэдку абкінуць задаволеным поглядам краму... [1, с.69];

в) неадушаўлёныя канкрэтныя назоўнікі з чыста ацэначным (эмацыянальным) значэннем:

Ганулья без канца чытала, перачытвала *паперку* [1, с.18]; У цеснай *хацёнцы* – пузатымі клёцкамі поўзаюць [1, с.16]; Ён быў у высокіх *боцікаx* з блішчастымі мяккімі *халяўкамі*, на паліто *каўнерык* з нейкага шэранькага звярка [2, с.84];

г) адцягненыя паняцці:

Як назло, і жонка Ягорава – хоць бы *слаўцом* кранула: маўчыць, нібы не бачыць нічога й не разумее [1, с.95]; Ён, здаецца, мокры, на ім чорныя крапінкі, ён – *частачка* асенняй свежасці [2, с.66].

Прыведзеныя кантэксты з памяншальна-ацэначнымі словамі, ужытымі ў творах К.Чорнага і М.Зарэцкага, яскрава даказваюць, што яны выкарыстаны з пэўнай стылістычнай мэтай, для стварэння агульнага эмацыянальнага настрою, каларыту, выражэння ласкі, пяшчоты, харавства, адабрэння, часам абазначэння чаго-небудзь малога, нязначнага з адценнем спачування, шкадавання, іранічных адносін і г.д. Большасць эмацыянальна-ацэначных афіксаў спалучаецца з канкрэтнымі назоўнікамі, галоўным чынам з назвамі рэальных прадметаў, асоб, з'яў прыроды, грамадскіх з'яў, падзей, а таксама са словамі, якія абазначаюць розныя абстрактныя паняцці, стан, якасці і г.д.

**Літаратура**

1. *Зарэцкі М.* Збор твораў: у 4 т. / Зарэцкі М. – Мн.: Маст. літаратура, 1989. – Т.1. – 526 с.

2. *Чорны К.* Апавяданні. – Мн.: Нар. асвета, 1968. – 176 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова